ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1982

1 ВЕРАСНЯ

СЕРАДА

№ 24 (1362)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## НЯХАЙ ВАМ СПАДАРОЖНІЧАЕ ПОСПЕХ!

ДАРАГІ ПЕРШАКУРСНІК! Здзейснілася твая запаветная мара — сёння ты стаў паўнапраўным членам дружнай студэнцкай сям'і. Гэта падзея тым больш хвалюючая, што вучыцца ты будзеш у старэйшай навучальнай установе рэспублікі — Беларускім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна. Табе выпаў пачэсны абавязак працягваць слаўныя традыцыі шматтысячнага калектыву універсітэта, несці сцяг флагмана вышэйшай школы рэспублікі. Дазволь павіншаваць цябе з ганаровым званнем савецкага студэнта, пажадаць поспехаў у вучобе і грамадскай дзейнасці на карысць нашай вялікай Савецкай Радзімы, якая на працягу 60 гадоў праяўляла і праяўляе бацькоўскі клопат і ўвагу аб развіцці вышэйшай школы.

У мінулым годзе грамадскасць Беларусі шырока адзначыла 60-годдзе БДУ імя У. І. Леніна. Святкаванне юбілею універсітэта стала знамянальнай падзеяй у навуковым, грамадскім і культурным жыцці рэспублікі. Гэта з яго сцен выйшлі вядомыя вучоныя, настаўнікі, грамадскія і палітычныя дзеячы, пісьменнікі і паэты, гэта ён даў пуцёўку ў жыццё не аднаму пакаленню высокакваліфікаваных спецыялістаў, што самааддана працуюць на прамысловых прадпрыемствах і ў навукова-даследчых установах краіны, інстытутах і тэхнікумах, вучылішчах і школах. Іх справу працягваць табе, сённяшні першакурснік, іх славу памнажаць табе, заўтрашні спецыяліст!

Табе можна ганарыцца сваім універсітэтам. Агульнавядомыя яго заслугі ў развіцці навукі і ў падрыхтоўцы кадраў для розных галін народнай гаспадаркі краіны. Яны высока адзначаны Камуністычнай партыяй і Савецкім урадам. З 1949 года універсітэт носіць імя У. І. Леніна. У 1967 годзе ён узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Апошнія тры гады запар па выніках Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва універсітэт узнагароджваецца пераходным Чырвоным сцягам Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР, ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў. Гэта сведчанне таго, што калектыў БДУ імя У. І. Леніна знаходзіцца ў пастаянным пошуку, у творчым гарэнні. Выдатная вучоба, актыўная жыццёвая пазіцыя — твой пасільны ўклад у агульную скарбонку здабыткаў універсітэта.

Вучыся вучыцца з першых дзён студэнцкага жыцця, імкніся быць у гушчы падзей, беспамылкова арыентавацца ў шырокім патоку навуковай і палітычнай інфармацыі. Студэнты універсітэта заўсёды вызначаліся сваёй мэтанакіраванасцю, эрудыцыяй, глыбокім разуменнем сучаснасці. Будзь варты іх!

Гады навучання ў БДУ імя У. І. Леніна — не толькі час напружанай вучобы, гэта пара спасціжэння самаадданай працы ў студэнцкіх будаўнічых атрадах, час праверкі сапраўднай дружбы, таварыскасці і сяброўскай падтрымкі. Ва універсітэце ты набудзеш шмат новых сяброў, расшырыш кола сваіх інтарэсаў, знойдзеш сабе захапленне па душы. Вялікую дапамогу акажуць табе камітэт камсамола, прафком, іншыя грамадскія арганізацыі.

Мы спадзяёмся, што кожны год твайго навучання ў Беларускім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна з'явіцца новай прыступкай на нялёгкім шляху да вяршыні ведаў, пасільным укладам у вырашэнне важных задач, што паставіў перад савецкім народам гістарычны XXVI з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, у здзяйсненне грандыёзных планаў пабудовы светлай будучыні чалавецтва — камунізму.

У добры шлях, дарагі першакурснік!

**РЭКТАРАТ**
**ПАРТКОМ**
**МЯСЦКОМ**
**КАМІТЭТ КАМСАМОЛА**
**ПРАФКОМ**



ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

## На шляхах рэалізацыі Харчовай праграмы

НЯДАЎНА адбыўся пленум партыйнага камітэта Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, які абмеркаваў вынікі майскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС і задачы партыйных арганізацый універсітэта па рэалізацыі Харчовай праграмы, палажэнняў і вывадаў даклада на Пленуме Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева.

Разглядаючы рашэнні майскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС як новае пераканаўчае праяўленне клопатаў партыі аб савецкіх людзях, камуністы, усе выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна імкнуцца ўнесці свой уклад у рэалізацыю Харчовай праграмы, ажыццяўленне аграрнай палітыкі КПСС.

Матэрыялы майскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС вывучаны ў сістэме партыйнай вучобы, адбыўся адзіны палітдзень па тэме «Харчовая праграма — справа ўсенародная», праведзены палітінфармацыі ва ўсіх акадэмічных групах. Матэрыялы Пленума, Харчовая праграма і задачы, якія вынікаюць з іх, абмеркаваны на адкрытых партыйных сходах пярвічных арганізацый. Намечаны канкрэтныя меры па больш актыўнаму выкарыстанню навуковага патэнцыялу кафедр і лабараторый, укараненню вынікаў навуковых даследаванняў у практыку сельскагаспадарчай вытворчасці, па аказанню шэфскай дапамогі працаўнікам вёскі, расшырэнню грамадска-палітычнай работы ў працоўных калектывах калгасаў і саўгасаў.

Разам з тым было адзначана, што работа некаторых падраздзяленняў патрабуе большых намаганняў у святле патрабаванняў майскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС. Партыйным арганізацыям, кіраўнікам падраздзяленняў і кафедр неабходна вызначыць тэматыку навуковых даследаванняў, якія маюць важнейшае значэнне для павышэння эфектыўнасці сельскагаспадарчай вытворчасці, перавозкі і захоўвання сельскагаспадарчай прадукцыі, мабілізаваць лепшыя навуковыя кадры на вырашэнне гэтых задач.

На пленуме выказана ўпэўненасць, што партыйныя, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі, увесь калектыў універсітэта прыкладуць максімум намаганняў па рэалізацыі рашэнняў майскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС.

На пленуме таксама было разгледжана пытанне аб задачах партыйных і грамадскіх арганізацый універсітэта па выкананню пастановы ЦК КПСС ад 9 сакавіка 1982 года «Аб рабоце Мінскага абкома партыі па развіццю сацыялістычнага спаборніцтва і павышэнню яго дзейснасці ў ажыццяўленні рашэнняў XXVI з'езда КПСС і ўказанняў таварыша Л. І. Брэжнева».

**В. ПЯТРОЎ.**

# ВУЧОБА, ПРАЦА, ТАЛЕНТ—

ЖАДАЕМ ВАМ...

## «Пашырайце свой кругагляд»

УСВЕДАМЛЯЮЧЫ, што паступленне, паспяховае перадоленне ўступных экзаменаў — вынік штодзённай упартай працы, усім сённяшнім першакурснікам хочацца пажадаць, каб яны былі такімі ж старанымі і надалей, працавалі пастаянна і рэгулярна.

Зараз кожнаму трэба хутчэй адапціравацца ў студэнцкім асяроддзі. Для гэтага лепш за ўсё хутчэй наладзіць дзелавыя зносіны і кантакты са студэнтамі старэйшых курсаў.

Выкарыстоўвайце і ўсе тыя магчымасці для ўсебаковага развіцця, што прадастаўляе буйны навуковы і культурны цэнтр, якім з'яўляецца сталіца нашай рэспублікі. Хочацца, каб за пяць год знаходжання ў БДУ вы атрымалі не толькі трывалыя веды і ўмелі іх выкарыстаць, але і ўзбагаціліся дасягненнямі нашай культуры, літаратуры, мастацтва.

Шматграннага вам жыцця!

**В. ЧЫГІР,**
**дэкан юрыдычнага факультэта, прафесар.**

## «Стаўце канкрэтныя мэты»

ТАМУ, ХТО ПРЫЙШОЎ зараз на першы курс, спачатку пажадаю дайсці да другога. Паступіць — гэта не галоўнае. Гэта, скажам, усяго дзесятая доля пастаўленай задачы. Галоўнае — настойліва вучыцца. Тыя, для каго мэтай жыцця было толькі паступленне ва універсітэт, які б факультэт яны ні абралі, к трэцяму курсу, як правіла, расчароўваюцца ў вучобе. Ім становіцца нецікава.

Каб не згубіць вашу сённяшнюю зацікаўленасць, не забывайце, што яе трэба падтрымліваць пастаяннай работай, а не чакаць натхнення. Спачатку цяжка выседзець у аўдыторыі шэсць гадзін. Пераадолейце сябе — і ўседлівасць увойдзе ў звычку. Стаўце перад сабою канкрэтныя мэты — і на кожным этапе дабівайцеся хоць і маленькіх, але поспехаў.

Займайцеся навукай. Займайцеся грамадскай работай. Але абавязкова выконвайце ўсё не механічна, а творча. Любую справу можна зрабіць творчай, калі чалавек сам гэтага захоча.

Самае дарагое, што ёсць у вас сёння,—час. Працуйце. Не трацце час марна, каб ніколі потым не шкадаваць аб гэтым.

А ў дасягненні сваёй мэты трэба заўсёды ісці да канца. Задача перад кожным з вас стаіць не ў тым, каб атрымаць дыплом, а ў тым, каб стаць добрым спецыялістам.

**Я. РАДЫНА,**
**загадчык кафедры функцыянальнага аналізу, лаўрэат прэміі імя Ленінскага камсамола Беларусі.**

## Клопаты аб новым папаўненні

ІНТЭРВ'Ю Ў НУМАР

**СЁННЯ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА РАСЧЫНІЎ СВАЕ ДЗВЕРЫ ДЛЯ СОЦЕНЬ ЮНАКОЎ І ДЗЯЎЧАТ, ШТО ПАСПЯХОВА ВЫТРЫМАЛІ НЯЛЁГКІ ЭКЗАМЕН НА ПРАВА НАЗЫВАЦЦА СТУДЭНТАМІ БУЙНЕЙШАЙ НАВУЧАЛЬНАЙ УСТАНОВЫ РЭСПУБЛІКІ. НАПЯРЭДАДНІ НАШ КАРЭСПАНДЭНТ А. ЛАЗОЎСКІ СУСТРЭЎСЯ З АДКАЗНЫМ САКРАТАРОМ ПРЫЁМНАЙ КАМІСІІ В. В. САМАХВАЛАМ І ПАПРАСІЎ ЯГО АДКАЗАЦЬ НА НЕКАЛЬКІ ПЫТАННЯЎ.**

**— Віктар Васільевіч, яшчэ, безумоўна, рана падводзіць канчатковыя вынікі прыёму студэнтаў на першы курс універсітэта. Аднак пра тыя рысы, што характарызуюць абітурыента-82, у Вас, відаць, склалася пэўнае ўражанне!**

— Па-першае, трэба адзначыць, што БДУ імя У. І. Леніна па-ранейшаму застаецца адной з самых папулярных ВНУ рэспублікі. Больш чатырох тысяч абітурыентаў прынялі ўдзел ва уступных экзаменах. Найбольшая колькасць заяў была пададзена на спецыяльнасці правазнаўства, гісторыя, матэматыка (вытворчы паток), біялогія... У гэтым годзе ў параўнанні з мінулым значна павялічылася колькасць абітурыентаў-медалістаў, а таксама выпускнікоў тэхнікумаў і ГПТВ, што маюць выдатныя атэстаты. І да іх гонару большасць з іх грунтоўнымі ведамі пацвердзілі адзнакі атэстата.

Наогул, сённяшнія абітурыенты—гэта ўсебакова развітыя маладыя людзі. Многія з іх паступалі ва універсітэт, маючы за плячыма службу ў радах Савецкай Арміі, або працавалі на прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах. Шмат было сярод паступаўшых удзельнікаў і пераможцаў школьных алімпіяд, членаў гурткоў юных.

**— Работа з такім шматлікім кантынгентам патрабавала ад усяго саставу прыёмнай камісіі максімуму ўвагі да кожнага паступаючага, аб'ектыўнасці і добразычлівасці...**

— Сапраўды, члены прыёмнай камісіі павінны былі быць кампетэнтнымі ў розных пытаннях, а іх шмат узнікала ў час работы. Нашым правілам было: за скупымі радкамі характарыстык і бясстраснымі лічбамі атэстатаў убачыць перш за ўсё чалавека.

Што датычыць прыёму дакументаў і ўступных экзаменаў, то яны вяліся строга па Правілах прыёму і Палажэнню аб экзаменацыйных камісіях.

**— Ці не маглі б Вы спыніцца на тых мерапрыемствах, што вызначалі работу камісіі ў гэтым годзе?**

— Якасны паказчык набору ў многім залежыць ад таго, як папрацавалі члены прыёмнай камісіі на працягу вучэбнага года, на які ўзровень была пастаўлена работа сярод моладзі горада і вёскі, ва ўстановах і воінскіх калектывах. Карыснымі ў гэтых адносінах сталі сустрэчы выкладчыкаў і студэнтаў з маладымі рабочымі і калгаснікамі, воінамі Савецкай Арміі, школьнікамі, паездкі ў аддаленыя раёны рэспублікі. Значнае месца ў прафесіянальнай арыентацыі належыць школам юнага матэматыка, фізіка, праграміста, біёлага, географа, карэспандэнта. У іх будучыя абітурыенты бліжэй знаёмяцца з абранай спецыяльнасцю, набываюць веды, якія дапамагаюць ім у час уступных экзаменаў. Многа даюць абітурыентам і падрыхтоўчыя курсы. У гэтым годзе на ўсіх формах вучобы —

## ВЫПУСКНІК-82 — ПЕРШАКУРСНІКУ-82

## «ТЫ ЗАМЯНІЎ МЯНЕ Ў АЎДЫТОРЫІ»

**ЛЮДМІЛА АНЦІЛЕЎСКАЯ (філфак):** Вельмі хацелася б апынуцца на вашым месцы, першакурснікі! І зрабіць усё, чаго мы самі не паспелі за сваё студэнцкае жыццё. Эх, каб была магчымасць вярнуць назад гэтыя 5 год! Яны цудоўныя нават тады, калі за апошнюю ноч перад экзаменам трэба прачытаць пяць-шэсць кніг; калі, выцягнуўшы «нешчаслівы» білет, ты амаль аўтаматычна пазбаўляешся стыпендыі; калі не паспяваеш ні снедаць, ні абедаць, а на канікулах здзіўляеш бацькоў нябачаным апетытам... Хочацца, каб вы стойка перанеслі «прыцірку» характараў у групе. Усе часовыя цяжкасці — не галоўнае ў студэнцкім жыцці.

Няхай ніколі не прыйдзе да вас пачуццё перанасычанасці навукай, ніколі не прыйдзе расчараванне ў выбары свайго жыццёвага шляху. Тым, хто прыйшоў на наш факультэт, універсітэт адкрые асаблівую краіну, якой няма нідзе на карце свету, назва якой вельмі музычная і прыгожая — філалогія, навучыць любіць мову і літаратуру, дапаможа знайсці сябе, вызначыць сваю будучыню, дасць сяброў добрых, сапраўдных, верных. Але памятайце, што ўсё гэта будзе «мёртвым грузам», калі вы не навучыцеся дзяліцца з сябрамі ўсім, што маеце. Даваць, а не браць — вось багацце! І ўсвядоміць гэта таксама вам дапаможа універсітэт.

**МІКАЛАЙ ЯРМОЛА (ФПМ):** Я заўсёды марыў стаць студэнтам БДУ, вучыцца ў выдатных вучоных, педагогаў. Мая мара здзейснілася, і я атрымаў, як і хацеў, выдатную прафесію. Таму, хто прыйдзе на маё месца, жадаю быць актыўным ва ўсіх справах. Па сабе ведаю, як гэта важна.

**ЛЮДМІЛА СІВАКОВА (фізфак):** Студэнцкія гады будуць успамінацца доўга. Столькі цікавага ўмясцілася ў іх! Першакурснікам хацелася б параіць імкнуцца не прапускаць заняткі. На жаль, здараецца, што самымі цікавымі былі тыя лекцыі, якія прапусціў...

**УЛАДЗІМІР СЕРЫКАЎ (мехмат):** БДУ навучыў мяне самастойна працаваць. Запомніўся курс, які чытаў нам акадэмік АН БССР Д. А. Супруненка. Ён пасля кіраваў маёй дыпломнай работай. Творчае супрацоўніцтва з чалавекам, які добра ведае сваю справу, дапамагло мне палюбіць навуковы пошук, пазнаць усе яго цяжкасці, адчуць радасць і гонар, калі задума атрымліваецца. Тым, хто хоча займацца навукай, жадаю не распыляцца. Творча падыходзьце да супрацоўніцтва з навуковым кіраўніком. А яшчэ — ездзіце ў будатрады. Яны зараджаюць кожнага энергіяй жыцця, вучаць працаваць, пераадольваць цяжкасці. Яны даюць магчымасць пабачыць краіну. Я не хачу прыніжаць і значэнне сельгасработ. Яны таксама, асабліва на першым курсе, фарміруюць групу, вызначаюць яе характар, дапамагаюць пачынаючым студэнтам зразумець адзін аднаго.

**ВЯЧАСЛАЎ МАЛАФЕЕЎ (факультэт радыёфізікі і электронікі):** Хачу пажадаць першакурснікам, каб для іх універсітэт стаў трывалай прыступкай самастойнага жыцця. Каб тут набылі яны ўсе неабходныя навыкі не толькі па абранай спецыяльнасці, але і такія агульначалавечыя якасці, як працавітасць, добрасумленнасць, павага да таварышаў.

Ужо на малодшых курсах трэба вызначыць сваё навуковае прызванне, схільнасць і рыхтавацць сябе да рашэння зацікавіўшай праблемы. Не трэба баяцца гучных назваў: штучны інтэлект, робацізацыя, касмічная сувязь... Усе гэтыя пытанні прыйдзецца вырашаць нашаму пакаленню. І да гэтага мы абавязаны сябе рыхтаваць.

*Выклік прыйшоў — радасць без слоў,*
*Не вымаўляліся словы.*
*Тры кіламетры з пошты дамоў*
*Бег я праз неруш сасновы.*

*Пад сонцам свяцілася кожнае дрэва,*
*Птушкі і неба віталі мяне.*
*Здаў! Паступіў!—супакойцеся, нервы,*







# ТАБЕ, ДАРАГАЯ РАДЗІМА!

дзённай, вячэрняй і завочнай займалася звыш трох тысяч чалавек.

**— Віктар Васільевіч, якія факультэты, на Вашу думку, найбольш адказна аднесліся да набору студэнтаў як на працягу вучэбнага года, так і ў час уступных экзаменаў!**

— У першую чаргу можна адзначыць механіка-матэматычны факультэт, факультэт прыкладной матэматыкі, хімічны факультэт. Добрых слоў заслугоўваюць члены прыёмнай камісіі юрыдычнага факультэта: праз іх рукі прайшло больш 600 асабістых спраў абітурыентаў. Факультэт журналістыкі, напрыклад, зыходзячы з паступлення заяў і вынікаў уступных экзаменаў, ужо вызначыў гарады і вёскі рэспублікі, у якіх выкладчыкі і студэнты факультэта асабліва плённа папрацавалі на працягу вучэбнага года, намеціў раёны, дзе неабходна ўзмацніць работу па прафарыентацыі.

**— Што Вы пажадаеце сённяшнім першакурснікам, а таксама членам прыёмнай камісіі-83?**

— Год сёлетні — юбілейны. Дарэчы, ва універсітэце на першым курсе будуць займацца студэнты трыццаці нацыянальнасцей нашай краіны. Спадзяюся, што кожны, хто паступіў у БДУ імя У. І. Леніна, сур'ёзна аднёсся да выбару сваёй прафесіі. Хачу пажадаць ім шчаслівай жыццёвай дарогі, творчага гарэння, пошукаў і знаходак. А будучаму саставу прыёмнай камісіі — вялікага конкурсу.

## ЗРАБІЦЬ ПЕРШЫ КРОК

БАЦЬКІ АЛЕГА Дзегцярова не хваляваліся, якую прафесію выбера сын, кім стане. Яны ведалі, што Алег вырашыў паступаць ва універсітэт на радыёфізічны факультэт. Не пярэчылі, бо бачылі: выбар не выпадковы.

У школе Алег займаўся на выдатна па ўсіх прадметах, але фізіку адразу вылучыў з астатніх навук. Урокі фізікі здаваліся найбольш цікавымі, ды і дома хлопчык мог гадзінамі разбірацца ў схемах, рашаць задачы. Настаўніца Тамара Якаўлеўна Гірыс заўважыла здольнага і настойлівага вучня, пачала працаваць з ім дадаткова. У сёмым класе Алег Дзегцяроў заняў першае месца на гарадской алімпіядзе, а праз два гады стаў пераможцам і ў вобласці.

Захапленне юнака фізікай набыло больш сур'ёзны напрамак, калі ў школу прыйшоў Я. Курашоў і арганізаваў гурток радыётэхнікі. Чалавек шчыры, вялікі знаўца сваёй справы, ён здолеў сабраць вакол сябе школьнікаў, зацікавіць іх. Алег зразумеў: радыётэхніка для яго — галоўнае.

Аднакласнікі ведалі А. Дзегцярова не толькі як выдатнага вучня. Ён вёў вялікую грамадскую работу, быў сакратаром школьнага камітэта камсамола, членам бюро гаркома. Самыя цікавыя мерапрыемствы не праходзілі без яго ўдзелу. Алег паспявае ўсюды: мае першы разрад па лёгкай атлетыцы, быў самым цікавым дыск-жакеем. Але ўсе яго шматлікія справы не толькі не перашкаджалі, а наадварот, дапамагалі галоўнаму — заняткам фізікай і радыётэхнікай. Юнак ведае, што сучасны вучоны — перш за ўсё чалавек living рознабаковых ведаў і захапленняў, ён не звужае кола сваіх уласных інтарэсаў, прымае ўдзел ва ўсіх сферах грамадскага жыцця.

А. Дзегцяроў з залатым медалём закончыў школу, выдатна здаў уступны экзамен. Яго мэта — стаць вучоным-радыёфізікам, займацца праблемамі аўтаматызацыі навуковых працэсаў, прынесці ў навуку нешта сваё. Добра, калі з першых жыццёвых крокаў ёсць яна, мара запаветная. Паступленне ва універсітэт — гэта толькі першая прыступка да яе, але адначасова і сур'ёзная заяўка на будучыню, бо кожная дарога пачынаецца з першага кроку. І цудоўна, што робіцца ён чалавекам упартым, зацікаўленым у сваёй справе.

Калі размаўляеш з Алегам, здзіўляе яго вера ў свае сілы, настойлівасць і рашучасць. Кажу яму, што не так лёгка стаць сапраўдным вучоным, ды яшчэ наватарам, у жыцці шмат непрадбачанага.

У адказ:

— Ведаю. Я выбраў адзіны шлях у жыцці, і ён дарагі мне, хай і цяжкі. Упэўнены, што ніколі не здраджу сваёй мары, абавязкова дасягну мэты.

**І. ЦАЛУЙКА,**
**наш кар**

ЖАДАЕМ ВАМ...

## «Дрэнны той салдат, які не марыць стаць генералам»

Я ЎПЭЎНЕНЫ, што ты, сябра-першакурснік, за гэты час атрымаў ужо шмат віншаванняў. З задавальненнем далучаюся да іх. Але (у жыцці часта сустракаецца гэта «але») ці добра ты ведаеш, што значыць быць студэнтам? «Цудоўныя гады, самы шчаслівы і вясёлы час»,— сцвярджаюць у адзін голас твае старэйшыя знаёмыя. Яны не памыляюцца, а толькі забываюць дадаць, што гэта адначасова і вельмі цяжкія гады. Цяжкія таму, што ніякая праца, калі не адносіцца да яе абыякава, не бывае лёгкай. Твая праца — вучэнне. Ты ўжо вучыўся ў школе, і гэты працэс не здаваўся табе вельмі складаным. Так, так, вось толькі адносіны паміж табой і выкладчыкамі цяпер зменяцца. Цябе не будуць, як нейкі посуд, напаўняць ведамі. Ты павінен здабыць іх сам, бо, як гавораць мудрыя людзі, навучыць нельга, можна толькі дапамагчы навучыцца. І добра, калі ўжо з першых сваіх крокаў у навуку ты схаваеш у сваім ранцы (прабач, у элегантным «дыпламаце») маршальскі жэзл, калі не будзеш спыняцца на дасягнутым, калі мэтанакіраванасць, уласная воля і самавыхаванне стануць тваімі спадарожнікамі. Не губляй сваёй мары! На працягу пяці гадоў усякае здараецца. Можа ўбачыш нейкія лёгкія сцяжынкі, можа проста стомішся, вось тут і прыйдзе спакуса здрадзіць сваёй мары. Выратаванне ў адным — у тваёй працаздольнасці. Гэта талент, які заўсёды дапаможа і ў вучобе, і ў жыцці.

Сёння ты апынуўся ў новым калектыве, разам з якім пройдзеш сур'ёзнае выпрабаванне на чалавечую сталасць. Універсітэт, як лакмусавая паперка, выявіць усе якасці твайго характару. І дзе б ты ні быў: на «бульбе» ці ў студэнцкім будаўнічым атрадзе, на спартыўнай пляцоўцы ці ў аудыторыі — заўсёды памятай, што няма такіх абставін, якія б прымусілі цябе забыць простае, але надта ж патрэбнае: шануй гонар замалада. І тады, як бы ні перашкаджалі табе спрадвечныя чалавечыя ворагі — лянота, зайздрасць, мяшчанства, дарога твая будзе роўнай, бо крочыць па ёй сумленны чалавек. Я не жадаю табе жыцця без цяжкасцей, а жадаю набыць уменне іх перадольваць. Толькі ў такім выпадку ты адчуеш асалоду ад працы. Складанай табе дарогі, першакурснік!

**А. СЛУКА,**
**дэкан падрыхтоўчага аддзялення, лаўрэат прэміі імя Ленінскага камсамола Беларусі.**

*Шчасце такое ўжо не міне.*
*Шчаслівы я еду ў горад вялікі,*
*Хачу спазнаць па-іншаму свет.*
*У краіне экзаменаў і залікаў*
*Мяне акрыляе універсітэт.*

*Ён — цішыня і хваляванне,*
*Майго юнацтва зацвіўшы сад,*
*Мой БДУ — маё дыханне,*
*Мая надзея на далягляд!*





## ІМГНЕННІ ТРЫВОГ І НАДЗЕЙ

РЭПАРТАЖ

БАЦЬКІ, што запоўнілі фае фізічнага корпуса, з нецярплівасцю пазглядалі на гадзіннікі: там, на трэцім паверсе, іх сыны і дочкі здаюць апошні экзамен.

— Мама, пяць!—падбягае да сваёй маці бялявая дзяўчына. Яна задаволена: паступіла ва універсітэт.

Не паспела маці павіншаваць дачку, як яе акружылі іншыя бацькі.

— Які білет?

— Якія пытанні?

— Вы маю дачку не бачылі?

А дзяўчына ў думках усё яшчэ ў аўдыторыі, дзе яна атрымала выдатную адзнаку.

Амаль увесь жнівень універсітэт нагадвае патрывожаны вулей, аднак цяпер замест упэўненых студэнтаў аўдыторыі запоўнілі нясмелыя абітурыенты. І хоць сёння апошні экзамен, рух на калідорах не зменшыўся.

...Абітурыенты хімічнага факультэта здаюць фізіку. Побач трымаюць экзамен па свайму асноўнаму прадмету біёлагі.

Які ж гэта дзіўны народ— абітурыенты. Аб іх кароткім абітурыенцкім жыцці можна расказаць шмат гісторый. Усе яны адначасова падобныя паміж сабой і адрозніваюцца адзін ад аднаго. Адрозніваюцца рознымі шляхамі, што прывялі ва універсітэт. А падобныя тым, што ўсе хочуць стаць студэнтамі БДУ. Не ўсім гэта ўдаецца, але кожны стараецца дасягнуць запаветнай мары.

...З аўдыторыі выходзіць дзяўчына.

— Ну, што?—не церпіцца даведацца абітурыентам.

— Чатыры.

— Дык гэта ж цудоўная адзнака!

—Мне трэба было пяць,—і дзяўчына панура пайшла да выхаду...

Абітурыенты працягваюць хвалявацца: экзамен у іх наперадзе.

Маша пачала шукаць ліст паперы. Шукала, шукала, а ён перад ёю на стале ляжыць...

Таня ад хвалявання дванаццаць на шэсць множыла слупком.

Высокі русы юнак у думках паўтарае матэрыял, хвалюецца.

— Абавязкова хачу працаваць у галіне біялогіі, — звяртаецца ён да суседкі.— Хацеў паступаць у медінстытут, але рашыў потым на біяфак.

На калідоры пацішэла, апошнія абітурыенты зайшлі ў аўдыторыю. Праз некалькі хвілін першым выходзіць той самы юнак. Па яго выгляду можна адразу зразумець, што яму не ўдалося атрымаць добрую адзнаку.

— Пайду дамоў,—разгублена гаворыць ён, але потым цвёрда дадае:—Буду зноў абавязкова паступаць ва універсітэт.

Перад экзаменатарам засталася толькі дзяўчына, якая нядаўна размаўляла з юнаком. Оля Скрыпко хоць і хвалюецца, але матэрыял ведае добра і заслужана атрымлівае «выдатна».

— Няўжо я студэнтка?— здзіўлена ўскліквае яна.— Думала, што так цяжка паступіць, але калі добра ведаеш, то зусім лёгка,—і Оля спяшаецца дадому абрадаваць сваіх бацькоў і сяброўак.

Экзамен закончыўся. Для многіх абітурыентаў ён быў апошнім, і яны будуць здаваць экзамены ўжо студэнтамі. А некаторыя праз пэўны час стануць абітурыентамі. Калі мара запаветная, то яна павінна ажыццявіцца.

**У. АБРАМОВІЧ,**
**наш кар.**

## ДЫЯЛЕКТАЛАГІЧНАЯ ПРАКТЫКА

# *КУТОК ПРЫГОЖЫ І ВЯСЁЛЫ*

ЛЕТАМ, на схіле сонечнага ліпеня, студэнты другога курса філалагічнага факультэта пабывалі на радзіме Якуба Коласа на Стаўбцоўшчыне, дзе яны праходзілі дыялекталагічную практыку. Родныя мясціны песняра, яго слова і песні цікавяць і хвалююць сёння кожнага, каму блізкая і дарагая творчасць вялікага сына Беларусі.

Акінчыцы, Ласток, Альбуць, Смольня, Мікалаеўшчына — гэта тыя куточкі Стаўбцоўшчыны, дзе, здаецца, і цяпер бачыш Коласа, чуеш яго голас, слухаеш разам з ім гоман дубоў-волатаў. А побач — Нёман, такі ціхі і блакітны, як неба над Мікалаеўшчынай.

Вобразы мілыя роднага краю,
Смутак і радасць мая!
Што маё сэрца да вас парывае?
Чым так прыкован я
К вам, мае ўзгорачкі роднага поля,
Рэчкі, курганы, лясы,
Поўныя сумнай красы? —

пісаў паэт. І сапраўды, веліч і хараство прыроды радзімы Якуба Коласа — жывыя вобразы роднага беларускага краю. І не паэт тут стане паэтам. Мусіць таму і першы верш Коласа быў аб прыродзе, ён называўся «Вясна»...

Адна група студэнтаў-філолагаў спынілася ў вёсцы Мікалаеўшчына, дзе яны павінны запісаць мову землякоў Я. Коласа. У Мікалаеўшчыне і цяпер жыве 62 сям'і Міцкевічаў, якія з'яўляюцца далёкімі і блізкімі сваякамі Канстанціна Міхайлавіча. Многія мікалаеўцы ўвайшлі ў творы Коласа пад сваімі сапраўднымі імёнамі і прозвішчамі, нават знешнія іх рысы і характарыстыкі вельмі дакладныя, бо спісаны з канкрэтных людзей, якія яшчэ жывуць і помняць свайго земляка. Многія жыхары Мікалаеўшчыны сустракаліся з Якубам Коласам, гутарылі з ім, хадзілі на рыбалку, у лес па грыбы.

Мне і Алесю Квяткоўскаму вельмі пашанцавала. На два тыдні нас узяў на кватэру Ігнат Ігнатавіч Міцкевіч. Хата Ігната Ігнатавіча знаходзіцца недалёка ад школы. Школу некалі пабудаваў сам Колас; яна зараз і носіць яго імя. Кожны дзень старэнькі Ігнат Ігнатавіч расказваў нам пра жыццё жыхароў Мікалаеўшчыны, пра іх звычаі, працу. «Канстанцін Міхайлавіч яшчэ, можа, і нейкая радня мне,— расказвае І. І. Міцкевіч.— Ён вельмі любіў сваіх землякоў, любіў Мікалаеўшчыну, Нёман. Вазьміце такі факт. У 1940 годзе, напрадлецці, згарэла ўсё наша сяло. Тады адразу адгукнуўся Колас, шмат дапамог нам, і мы хутка адбудаваліся, сталі на ногі. І школа вось, і бальніца, гэта таксама Колас пабудаваў за свае грошы. Дзякуй яму! Хутка будзе 100 гадоў з дня нараджэння Канстанціна Міцкевіча. Ён за мяне на 17 гадоў старэйшы, але сябраваў са мною шчыра і доўга. Я часта яго ўспамінаю».

Па суседству з Ігнатам Ігнатавічам Міцкевічам жыве Яўгенія Сальвестраўна Сотнік, якая нядаўна адзначыла сваё васьмідзесяцігоддзе. Мы сустрэліся з ёю, і яна пачала з любоўю расказваць пра Якуба Коласа: «У нас было гумно, а ў гумне сховішча, дзе хаваліся ад жандармаў Якуб Колас і мой брат Уладзя. Калі давалі сігнал, то ў падрубе сховішча адкочваўся вялікі камень і Колас са сваімі сябрамі ўцякаў у лес. Колас быў вельмі разумны чалавек, ён такі быў з дзяцінства. Я яго бачыла позняй восенню 1939 года ў Мікалаеўшчыне. Ён выступаў каля разбуранай царквы. Колас быў добры, многім вучням вёскі аказваў дапамогу».

Студэнты У. Хількевіч і М. Хаустовіч два тыдні жылі ў хаце стрыечнай сястры Якуба Коласа Алены Пятроўны Дземідовіч. Алена Пятроўна чытала ім вершы і апавяданні Я. Коласа, спявала песні, якія любіў паэт.

Жыццё паказала, што палымянае мастацкае слова Якуба Коласа дайшло да народа, да родных сёл, знайшло водгук у сэрцах мільёнаў працоўных. У народна-дыялектнай мове землякоў Якуба Коласа да нашых дзён захаваліся некранутымі найлепшыя ўзоры народнай моватворчасці, якія зачароўваюць, захапляюць чытача шчырасцю і непасрэднасцю, трапнасцю і арыгінальнасцю.

**С. ЧЫГРЫН,**
**студэнт філфака.**



*ДА ПАБАЧЭННЯ, ЛЕТА! Развітальна махае крыламі бусел... А з чаго пачыналася яно, жаданае? З залацістага пляжу? З ляснога рознагалосся? З белага воблака рамонкаў? Не, лета пачыналася з радаснага крыку: «Канікулы!», з вясёлага дзіцячага гоману і з апошніх — яны ўжо рэдка дасягалі мэты — матчыных перасцярог: «Ты ж глядзі, многа не купайся!»*

*Студэнты — народ больш дарослы і, здаецца, больш сур'ёзны — глядзяць услед дзятве з затоенай зайздрасцю: у іх лета пачнецца пасля сесіі, і абвесціць пра яго пачатак зялёныя формы байцоў будаўнічых атрадаў.*

*А для дарослых? На жаль, для дарослых лета — гэта мары пра адпачынак і доўгая чарга ў касу за білетамі на поўдзень. Вось што такое лета. Але ўсё добрае мае той недахоп, што хутка канчаецца. Значна палягчэлі рукзакі ў турыстаў, якія завяршаюць свае апошнія летнія маршруты. У піянерскім лагеры ўжо вырашылі, хто будзе Золушкай на развітальным карнавале, байцы СБА напісалі дамоў лісты, намякаючы на хуткае вяртанне, а на поўдні паявілася чарга за білетамі ў адваротным кірунку.*

*...Дык чым жа канчаецца лета? Пругкімі пялёсткамі астраў? Першымі яблыкамі? Няўлоўным пахам восені? Не, лета канчаецца прылаўкамі магазінаў з надпісам «Куток першакласніка», хлопчыкамі і дзяўчынкамі, якія прымяраюць школьную форму, і чырвонымі шыльдамі «Сардэчна запрашаем», якія паявіліся каля ўваходу ў кожную школу, інстытут ці універсітэт.*

*Бывай жа, лета! Развітальныя кругі робіць бусел, хутка ён ператворыцца ў амаль нябачную кропку і панясе на сваіх крылах апошнія летнія дні.*

*Н. НАДЗЕЖДЗІНА.*

## З НАШАЙ ПОШТЫ

# БУДАВАЦЬ ДАПАМАГАЕ «ТАВАРЫШ»

...МАГУТНЫ самазвал перакуліў кузаў з бетонам. Закасаўшы рукавы, бяромся за справу: разграбаем бетон, роўна ўкладваем яго. Лічаныя хвіліны — і пляцоўка забетаніравана. З задавальненнем гляджу на таварышаў — гарыць справа ў іх руках.

Гэта працоўнае лета для «Таварыша» першае. Але ёсць ужо і майстры сваёй справы: Ігар Рыбалтоўскі, Наталля Антановіч, Юрый Карпенка. Рабочыя з «Віцебскводбуда» дапамогай задаволены. Спраўляемся з абавязацельствамі, прынятымі ў гонар 60-годдзя ўтварэння СССР, выконваем норму і за паэта Максіма Багдановіча. На адным са сходаў мы вырашылі расшырыць фронт работ і працаваць у суседнім калгасе. Асабліва стараліся пяць нашых замежных сяброў з Нікарагуа і Панамы. Грошы, зробленыя на гэтым суботніку, пералічаны ў Фонд міру.

Але жылі не працай адзінай. Сустракаліся з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, падарылі кніжкі мясцовай сярэдняй школе, былі на экскурсіі па Гарадку, словам, ёсць аб чым успомніць.

...У атрадаўскім дзённіку цалкам запоўнена графа «Што зроблена». Камандзір Аляксандр Халімончыкаў задаволены — старанна працавалі студэнты, добрую памяць пакіне пра сябе «Таварыш».

**І. ЗЫБАЙЛА,**
**баец СБА «Таварыш» журфака.**

# ТРЫ СКЛАДАЕМЫХ АТРАДА

### ШТРЫХІ ДА КАЛЕКТЫЎНАГА ПАРТРЭТА СБА

ГЭТА БЫЎ адзін з тых дажджоў, пра якія кажуць: лье, як з вядра. Да жаданага сховішча было рукой падаць, але дарогу перагарадзіў дзядзька-вахцёр.

— Куды? Бачыш, спрытныя якія!

— Дзядзечка, дазвольце схавацца, вы ж нас ведаеце, мы тут побач працуем.

Але спасылка на блізкае суседства толькі падліла масла ў агонь.

— Дык вось хто тут усё перарыў, прайсці няма як! І чаго тут бадзяецеся, чорт вас ведае!

— Гэта ж метро будуецца, а мы да яго кабель цягнем.

— Метро?.. Добрая справа. Заходзьце, рабяткі, чаго ж пад дажджом мокнуць.

«Нам пашанцавала,— смяецца камандзір універсітэцкага гарадскога будаўнічага атрада імя М. Мароза Леанід Лісун,— што мы маем дачыненне да метро, а то б прамоклі да ніткі». І ўжо сур'ёзна дадае: «Сапраўды пашанцавала, будуецца яшчэ толькі першая лінія метрапалітэна, і ў гэтым ёсць частка нашай працы — што можа быць цудоўней! Будзем потым заходзіць на станцыю «Акадэмічная» і ўспамінаць, якім жа цяжкім быў гэты кабель, якая асцярожная, можна сказаць, ювелірная была праца. Амаль усё мы робім уручную — так патрабуе тэхналогія».

Дождж скончыўся гэтак жа раптоўна, як і пачаўся, і мы з камандзірам працягвалі агляд уладанняў. За трэці працоўны семестр байцы асвоілі каля 100 тысяч рублёў капіталаўкладанняў. Атрад імя М. Мароза — адзін з лепшых гарадскіх СБА універсітэта. Што дапамагло ім стаць лепшымі? Які ён, правафланговы студэнцкі атрад, з чаго складаецца?

Калі бачыш Лёню Лісуна сярод байцоў атрада, можна нават і не пытаць, хто тут камандзір, — гэта адразу зразумела. Нешматслоўны, ён аддае распараджэнні дакладна, без мітусні і крыку. У яго манеры кіраваць, безумоўна, сказваецца і армейскі, і камсамольскі вопыт. Трэцяе студэнцкае лета Лёня кіруе гарадскім будаўнічым атрадам. «Ці хочацца куды-небудзь паехаць?» — задумліва паўтарае ён маё пытанне.— Нават не ведаю, вось ужо другое лета збіраюся ў выязны атрад і... зноў застаюся ў Мінску. Горад перамагае. А рамантыка? Справа ў тым, што лічыць рамантычным. Калі «увесь вагон сядзіць у адным купэ», дык гэта рамантыка далёкіх дарог, і яна, зразумела, выпадае на долю выязных атрадаў. А рамантыка працы ёсць усюды. І яшчэ невядома, якая з іх прыносіць больш задавальнення. Выпрабаванне працай, цяжкай фізічнай працай — гэта адначасова і выпрабаванне на чалавечую сталасць. Тут ідзе барацьба не за сваю асабістую адзнаку, як у час вучобы, а за выдатныя вынікі калектыўнай працы, і таму адзнака, якую паставяць таварышы па будатраду, можа і не супасці з «пяцёркамі» ў залікоўцы».

Знешне Вадзім Гарабец — поўная процілегласць камандзіру: невысокі, каранасты, гаваркі. Ён першакурснік, у атрадзе ўпершыню і, зразумела, упершыню камісарам.

Як спраўляецца ён са сваёй клапатлівай пасадай?

— Нас 25 чалавек. Лічыцца, што камісар — душа атрада. Каб гэта было так, яго абавязкі патрэбна аднесці да галіны грамадска-палітычнага жыцця, ён не павінен ператварыцца ў сакратара пры камандзіру.

— А што яшчэ турбуе?

— Лекавыя травы.

— Што?

Так, так, іменна лекавыя травы, якіх неабходна здаць не адзін кілаграм. Вось толькі дзе іх узяць у Мінску, калі нават юннаты скардзяцца, што ў прыгараднай зоне амаль знішчаны патрэбныя медыцынскай вытворчасці расліны? Знайшлі мы тут некалькі кустоў палыну, але ж гэта кропля ў моры.

Спачатку ўсё гэта здалося мне таксама кропляй у чарадзе камісарскіх спраў, але камісар — перш за ўсё ідэолаг. Ён павінен убачыць у моры штодзённых клопатаў і такія, на першы погляд непрыкметныя, парасткі фармалізму... А сапраўды, можа было б разумней вызваліць гарадскія атрады ад здачы лекавых траў? Справа гэта, безумоўна, патрэбная, але яе можна было б даверыць, напрыклад, школьнікам, якія адпачываюць у піянерскіх лагерах.

Калі камандзір — мозг атрада, камісар — душа, то байцы — яго цела, тое, без чаго не патрэбны ні мозг, ні душа. Усе яны ведалі адзін аднаго і раней, вучыліся на адным патоку фізічнага факультэта, але ў атрадзе як бы пазнаёміліся нанава: тут іншыя крытэрыі.

Атрад выхоўвае. Ён дае ўрокі не толькі працавітасці, але і этыкі. Ніхто з іх, будучых інтэлігентаў, ужо не зможа няўважліва аднесціся да спраў рабочага, абавязкова ўспомняцца ўласныя працоўныя мазалі на руках.

Атрад збліжае. У кожнага ў памяці першы дзень. Чаму? Напэўна, таму, што ён быў першым. Неперадаваемае адчуванне цаліны, некранутасці. І нейкі страх: «Няўжо зможам?» Цяпер ведаюць: змаглі!

Атрад называе імёны... Добрасумленнасць, працавітасць, шчырасць на дапамогу — яны заўсёды ў пашане. І той, хто надзелены гэтымі рысамі характару, у працоўным калектыве будзе на сваім месцы. Гэта і Сяргей Анацка, які за выдатную працу ўзнагароджаны значком «Ударнік СБА-1982», і Павел Асламаў і Сяргей Зотаў, і... так можна пералічыць амаль увесь атрад, нездарма ж ён атрымаў Грамату гаркома ЛКСМБ за актыўны ўдзел у працоўным семестры 1982 года.

Закончылася будатрадаўскае лета. Атрад імя М. Мароза падводзіць вынікі. Сёння яшчэ цяжка сказаць, якія байцы будуць працаваць у ім у наступным годзе. Хочацца пажадаць аднаго, каб тры нязменных складаемых атрада — байцы, камісар, камандзір — заўсёды складалі надзейную суму.

**Н. КАЛІШЭВІЧ.**


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

1 верасня 1982 г.

АТ 21418 Заказ 1552

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ